УДК 373.5 : 811.161.3

# ВЫКАРЫСТАННЕ АКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎ, ПРЫЁМАЎ І ФОРМАЎ НАВУЧАННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ

**Балахонава Наталля Фёдараўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)

**Жвалевіч Таццяна Мікалаеўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)

*Ключавыя словы: актыўны метад, прыём, форма навучання, урок, беларуская мова, вучэбная дзейнасць, этапы ўрока.*

*У артыкуле даецца сістэмнае апісанне выкарыстання актыўных метадаў, прыёмаў і формаў навучання на розных этапах урока беларускай мовы: пры правядзенні арганізацыйнага моманту, на этапе праверкі дамашняга задання, на аперацыйна-пазнавальным этапе, падчас рэфлексіі.*

Кожны настаўнік беларускай мовы і літаратуры імкнецца, каб яго вучні з ахвотай вывучалі і дасканала ведалі гэтыя прадметы. А. Г. Арлова слушна заўважыла, што "матывацыя школьнікаў – адзін з крытэрыяў эфектыўнасці педагагічнага працэсу" [1, с. 38–41]. У сваю чаргу даследчык І. Ч. Босы адзначае, што "пазнавальная (вучэбная) актыўнасць вучня выражаецца ў імкненні вучыцца, пераадольваючы цяжкасці на шляху здабывання ведаў, у прыкладанні максімуму асабістых валявых намаганняў і энергіі ў разумовай працы" [2, с. 3–7]. Прааналізаваўшы асноўныя прычыны зніжэння якасці ведаў вучняў, мы прыйшлі да высновы, што ў аснове навучання павінен быць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прынцып пазнавальнай актыўнасці. Вопыт выкарыстання актыўных метадаў, прыёмаў і формаў дае добрыя вынікі, таму з цікавасцю быў сустрэты не толькі вучнямі, але і выкладчыкамі школы падчас правядзення адкрытых урокаў.

Урокі беларускай мовы вельмі прыдатныя для прымянення розных нестандартных форм і метадаў вучэбнай дзейнасці, у тым ліку і актыўных. Іх выкарыстанне дапамагае стварыць займальную сітуацыю на занятках, творча раскрыцца асобе, прымусіць з цікавасцю працаваць увесь клас. Кожны ўрок мэтазгодна пачынаць з фарміравання ў вучняў матывацыі да навучання. Гэтаму спрыяе стварэнне эмацыянальнага настрою, што дапамагае засяродзіць увагу вучняў да ўрока, абудзіць цікавасць, для чаго выкарыстоўваюцца шматлікія прытчы, урыўкі з твораў мастацкай літаратуры і фальклору, якія маюць павучальны сэнс і выклікаюць вучняў на роздум, вершы беларускіх паэтаў, метад “Камплімент”.

Этап праверкі дамашняга задання дае магчымасць не толькі выявіць узровень ведаў, навыкаў, але і фарміруе ў кожнага з іх пачуццё адказнасці за сваю працу.На гэтым этапе выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы: “Пошук агульнага” (прапануецца вучням знайсці агульныя прыметы (па якім прынцыпе аб’яднаны слова (літары) ў групе)); “Пільнае вока” (сутнасць прыёму ў тым, што вучні павінны знайсці памылкі ў запісаных словах (сказах), выправіць іх); “Эстафета” (на дошцы для кожнай каманды запісаны словы, у якіх трэба ўставіць прапушчаную арфаграму (або выправіць памылку)). Праверка дамашняга задання ў групах па 4–5 чалавек спрыяе выпрацоўцы арфаграфічнай пільнасці вучняў, развіццю мовы, камунікатыўных навыкаў. Дзеці вучацца аб’ектыўна ацэньваць свае веды і веды аднакласнікаў.

Важным момантам з’яўляецца знаёмства з тэмай, мэтай, задачамі. Падчас паведамлення новай тэмы вучні самі спрабуюць вызначыць мэту ўрока, а пры пастаноўцы задач эфектыўным з’яўляецца прыём “Тэлеграма”: на дошцы запісваецца слова, на кожную літару якога патрэбна сфармуляваць задачы. Для стварэння праблемнай сітуацыі карысна выкарыстоўваць разнастайны наглядны матэрыял. Кожнаму віду працы на ўроку даецца цікавая назва (“У гасцях у слова”, “Апрані слова”, “Арфаэпічная хвілінка”, “Падбяры сваякоў”, “Карэктар” і іншыя), што таксама актывізуе ўвагу вучняў і спрыяе іх актыўнай дзейнасці. В.У Быхавец адзначае, што на аперацыйна-пазнавальным этапе арганізуецца вучэбная дзейнасць вучняў па “адкрыцці” новых ведаў і іх засваенні. Асноўнымі мэтамі гэтага этапу аўтар называе арганізацыю мэтанакіраванай пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні новых ведаў, стварэнне сітуацыі ўзаемадзеяння [3, с. 27–48]. Арганізацыя дзейнасці вучняў на аперацыйна-пазнавальным этапе на кожным уроку праходзіць па-рознаму, бо залежыць ад узросту вучняў, іх падрыхтаванасці, ад ступені складанасці вучэбнага матэрыялу і яго навізны. У гэтых адносінах



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

эфектыўны праблемны метад, рэпрадуктыўны, часткова-пошукавы, творчы. Вучні ствараюць апорныя канспекты ў выглядзе табліц, блок-схем.

С. І. Ніяркевіч заўважае, што на ўроку немагчыма абысціся без самастойнай работы, якая "патрабуе высокага ўзроўню самасвядомасці, фарміруе ў вучняў устойлівы інтарэс, пры якім іх захапляе сам працэс атрымання новых ведаў, а самастойнае рашэнне нестандартных задач прыносіць задавальненне. Метад самастойнай работы дазваляе развіваць пазнавальныя здольнасці вучняў, умацоўвае і павышае інтарэс, развівае творчае мысленне" [4, с. 12–18]. У залежнасці ад падрыхтаванасці вучняў арганізоўваецца самастойная работа з падручнікам, тэстамі, карткамі, слоўнікамі, выкарыстоўваецца даведачная літаратура. Важным і неабходным уяўляецца правядзенне лексічнай работы, работы з тэкстам, хвілінак творчасці, што дае магчымасць удасканальваць арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі і ўменні, маўленне вучняў, узбагачаць слоўнікавы запас слоў, развіваць творчыя здольнасці вучняў.

Пры тлумачэнні новага матэрыялу, а таксама для яго замацавання, прымянення ў новых сітуацыях карысна выкарыстоўваць гульні-практыкаванні, віктарыны, крыжаванкі, рэбусы і інш. У працэсе гульні ў вучняў фарміруюцца якасці актыўных удзельнікаў, яны вучацца знаходзіць і прымаць рашэнні, атрымліваць радасць ад зносін з аднакласнікамі. Грунтоўнасць засваення новай тэмы на ўроку правяраецца з дапамогай прыёму "Тэма ў пытаннях". Вучні самастойна складаюць пытанні па вывучанай тэме, што дазваляе выявіць глыбіню яе асэнсаванн вучнямі, бачыць прабелы ў засваенні матэрыялу. Пры завяршэнні тэмы эфектыўны прыём "Лінгвістычны дыктант". Метад "Запоўні табліцу" дазваляе працягнуць працу па выпрацоўцы арфаграфічных навыкаў. Выканаўшы работу над памылкамі, вучні запісваюць словы ў адпаведную калонку пад назвай "арфаграмы". На ўроках можна выкарыстоўваць метады кантролю і самакантролю ў навучанні. Плануемы вынік – выкананне тэставага задання, знаходжанне памылак, цяжкасцей, іх карэкцыя. Для замацавання атрыманых ведаў вельмі важна выкарыстоўваць міжпрадметны матэрыял, па якім праводзілася работа ў класе.

На этапе рэфлексіі мэтазгодна прапаноўваць вучням наступныя заданні: "Дапоўніце сказы", "Самае…", "СМС – пасланне", "Зярняткі ведаў", падабраць ключавыя словы да тэмы ўрока, закончыць сказы, падрыхтаваць міні-сачыненне, адказаць на пытанні па аналогіі з апорай на мэты ўрока: "Што я здолеў? Чаму навучыўся? Што падалося лёгкім, а што цяжкім?" Карысна выкарыстоўваць прыём "Сінквейн", "Зоркі на небе", "Смайлік", "Прытча". Рэфлексія дапамагае ўдасканаліць вучэбны працэс і вылучыць асобу вучня. Рэфлексійная дзейнасць на ўроку – гэта важная ўмова для развіцця такіх якасцей асобы, як самастойнасць, уменне ацэньваць сябе, уласныя вынікі працы і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Па сутнасці, працэс навучання ўяўляецца як творчая дзейнасць, падчас якой выхоўваюцца самастойнасць, самакрытычнасць, фарміруецца ўменне разважаць, бо працэс навучання – гэта працэс дзейнасці вучня, накіраваны на стаўленне яго свядомасці і яго асобы ўвогуле, а развіццё творчых здольнасцей вучняў – адна з асноўных задач сучаснага навучання.

**Літаратура**


1. Арлова, А. Г. Мець свой стыль навучання / А. Г. Арлова // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 5. – С. 38–41.
2. Босы, І. Ч. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці праз дыферэнцыяцыю навучання / І. Ч. Босы // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 4. – С. 3–7.
3. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В. У. Быхавец ( і інш.); пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мінск : Сэр-Віт, 2006. – 208 с.
4. Нівяркевіч, С.І. Арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры / С. І. Нівяркевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 5. – С. 12–18.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова